# ВЫВУЧЭННЕ ТЭКСТУ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

***Т.М. Арэшчанка*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна)*
Навуковы кіраўнік – В. Я. Барысенка, канд. філал. навук, дацэнт

У методыцы выкладання беларускай мовы пад *тэкстам* разумеюцца два і больш сказаў, звязаных агульнасцю задумы, адзінствам тэмы, якія рэалізуюць пэўную камунікатыўную задачу, характарам якой абумоўлены адбор моўных сродкаў і кампазіцыйная структура выказвання.

На ўспрыманне тэксту ўплываюць суб'ектыўныя і аб'ектыўныя фактары. Да аб'ектыўных адносяцца ўласцівасці і якасці самога тэксту, да суб'ектыўных – індывідуальна-асобасныя ўласцівасці і якасці тых, хто ўспрымае тэкст.

Методыка працы настаўніка, якая арыентуе малодшых школьнікаў на ўспрыманне тэксту, павінна пастаянна карэкціравацца па меры павышэння ўзроўню, якасці ўспрымання і асэнсавання вучэбнага зместу.

Слоўнікавы склад, тэксты, якія прапаноўваюцца на занятках па мове ў пачатковай школе, і не толькі ў пачатковай, павінны у пэўнай меры, падрыхтоўваць вучняў да ўспрымання вучэбнага зместу па іншых прадметах. Большасць тэкстаў па шэрагу прадметаў вучні не разумеюць, таму не запамінаецца і не засвойваецца матэрыял.

Улічваючы важнасць чытання як успрымання, настаўнік пачатковых класаў павінен ведаць: псіхафізіялагічныя характарыстыкі працэсу чытання (характарыстыкі зрокавага аналізатара: інфармацыйныя, прасторавыя, часавыя), аптымальны для чытання стан аналізатара; аптымальна эфектыўную арганізацыю інфармацыйнага поля пры чытанні (прасторавую арганізацыю); уласцівасці ўспрымання вучнямі тэксту.

Падбор тэксту для працы – задача складаная. Неабходна ўважліва ставіцца да: аб'ёму тэксту для чытання і аналізу і для пісьма; слоўнікавага складу тэксту: у тэкстах, рэкамендуемых толькі для пісьма, не павінна быць слоў, незразумелых па значэнні; структуры і колькасці сказаў у тэксце; наяўнасці «перашкод» для чытання (ўспрымання); адпаведнасці тэкстаў ведам школьнікаў аб рэчаіснасці; зместу новай інфармацыі; адпаведнасці тэкстаў інтарэсам вучняў пэўнай узроставай групы; насычанасц і тэксту правяраемымі і неправяраемымі арфаграмамі.

Такім чынам, вызначэнне аб'ёму працы дае магчымасць разгорнута і ў той жа час канкрэтна прадставіць змест работы з тэкстам на ўроках беларускай мовы ў пачатковай школе.

МГПУ им. И.П. Шамякина